Голас Радзімы

№ 26 (1752)
1 ліпеня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



25 гадоў назад Беларусь стала шахцёрскай. Геолагі знайшлі на поўдні Мінскай вобласці вялікія запасы сільвініту, і тут з'явіліся шахты, узнік горад. Сёння ў Салігорску жыве 70 тысяч чалавек, большасць з іх — шахцёры.
НА ЗДЫМКУ: брыгада гарнякоў. (Фотарэпартаж пра Салігорск глядзіце на 3-й старонцы).

ПЕРСПЕКТЫВЫ СТРУГАЛЬШЧЫКА АНАТОЛЯ БЕДРЫКАВА
(«Як жыве індустрыяльны рабочы») стар. 3

ВАЧЫМА ПРАЎДЫ
(«Пастка») стар. 4

НА ПАКЛОН ДА КУПАЛЫ
(«Яго любілі, як бацьку» і фотарэпартаж аб свяце паэзіі ў Мінску) стар. 7

падзеі • людзі • факты

НА АРБІЦЕ САВЕЦКА-ФРАНЦУЗСКІ ЭКІПАЖ

З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ ТАСС

24 чэрвеня 1982 года ў 20 гадзін 30 мінут маскоўскага часу ў Савецкім Саюзе ажыццёўлены запуск касмічнага карабля «Саюз Т-6». Савецкі касмічны карабель пілатуе міжнародны экіпаж: камандзір карабля двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Уладзімір Джанібекаў, бортінжынер Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Аляксандр Іванчэнкаў і касманаўт-даследчык грамадзянін Францускай Рэспублікі Жан-Лу Крэцьен.

Праграмай палёту прадугледжваецца стыкоўка карабля «Саюз Т-6» з арбітальным навукова-даследчым комплексам «Салют-7» —«Саюз Т-5».

***

25 чэрвеня 1982 года ў 21 гадзіну 46 мінут маскоўскага часу зроблена стыкоўка касмічнага карабля «Саюз Т-6», пілатуемага савецка-французскім экіпажам, з арбітальным комплексам «Салют-7» — «Саюз Т-5».

Бартавыя сістэмы карабля «Саюз Т-6» і станцыі «Салют-7» забяспечылі выкананне ўзаемнага пошуку, збліжэння і стыкоўкі касмічных апаратаў. Абодва экіпажы дзейнічалі зладжана і з поўным узаемаразуменнем.

26 чэрвеня 1982 года ў 1 гадзіну маскоўскага часу пасля праверкі герметычнасці стыковачнага вузла экіпаж карабля «Саюз Т-6» перайшоў у памяшканне станцыі «Салют-7». У калязямной касмічнай прасторы на борце навукова-даследчага комплексу «Салют-7» — «Саюз Т-5» — «Саюз Т-6» пачалі сумесныя работы касманаўты Анатоль Беразавой, Валянцін Лебедзеў, Уладзімір Джанібекаў, Аляксандр Іванчэнкаў і Жан-Лу Крэцьен.

На працягу сямі дзён міжнароднаму экіпажу трэба будзе выканаць вялікую навуковую праграму, падрыхтаваную спецыялістамі Савецкага Саюза і Францыі. Запланаваны медыка-біялагічныя, тэхналагічныя і астрафізічныя эксперыменты, даследаванні зямной атмасферы, фатаграфаванне асобных раёнаў паверхні Зямлі акваторыі Сусветнага акіяна.

Сумесная работа савецкіх і французскага касманаўтаў на калязямной арбіце з'явіцца істотным укладам у вывучэнне і асваенне касмічнай прасторы ў мірных мэтах і паслужыць далейшаму развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Савецкага Саюза і Францыі.

ДЖАНІБЕКАЎ УЛАДЗІМІР АЛЯКСАНДРАВІЧ

Уладзімір Аляксандравіч Джанібекаў нарадзіўся 13 мая 1942 года ў пасёлку Іскандар Бастанлыкскага раёна Ташкенцкай вобласці.

Пасля заканчэння ў 1965 годзе Ейскага вышэйшага ваеннага авіяцыйнага вучылішча лётчыкаў служыў лётчыкам-інструктарам у ваенна-паветраных сілах.

У. Джанібекаў—член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1970 года.

У атрад касманаўтаў ён быў залічан у 1970 годзе.

Неаднаразова ўдзельнічаў у кіраванні палётамі пілатуемых касмічных караблёў і арбітальных станцый.

У. Джанібекаў зрабіў два касмічныя палёты: у студзені 1978 года ў якасці камандзіра карабля «Саюз-27» і першага экіпажа наведання станцыі «Салют-6», у сакавіку 1981 года ў якасці камандзіра карабля «Саюз-39», які даставіў на станцыю «Салют-6» міжнародны савецка-мангольскі экіпаж.

ЖАН-ЛУ КРЭЦЬЕН

Грамадзянін Французскай Рэспублікі Жан-Лу Крэцьен нарадзіўся 20 жніўня 1938 года ў горадзе Ла-Рашэль.

У 1959 годзе ён паступіў у ваенна-паветраную школу, якую закончыў у 1962 годзе. Сем апошніх гадоў Жан-Лу Крэцьен служыў лётчыкам-знішчальнікам у адной з баявых часцей ВПС Францыі, а затым лётчыкам-выпрабавальнікам. У 1977 годзе ён назначаецца намеснікам камандуючага ППА Паўднёвага раёна Францыі.

У 1980 годзе падпалкоўнік Жан-Лу Крэцьен пачаў трэніроўкі ў цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына. Прайшоў поўны курс абучэння да палётаў на касмічным караблі «Саюз-Т» і арбітальнай станцыі «Салют».

ІВАНЧЭНКАЎ АЛЯКСАНДР СЯРГЕЕВІЧ

Аляксандр Сяргеевіч Іванчэнкаў нарадзіўся 28 верасня 1940 года ў горадзе Іванцееўка Маскоўскай вобласці.

Пасля заканчэння ў 1964 годзе Маскоўскага авіяцыйнага інстытута працаваў у канструктарскім бюро, удзельнічаў у распрацоўцы новых касмічных апаратаў.

А. Іванчэнкаў—член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1972 года.

Да касмічных палётаў Аляксандр Сяргеевіч пачаў рыхтавацца з 1970 года. Неаднаразова быў дублёрам бортінжынераў касмічных караблёў «Саюз», рыхтаваўся таксама да сумеснага касмічнага палёту караблёў «Саюз» і «Апалон» у якасці бортінжынера.

Свой першы палёт у космас працягласцю 140 сутак А. Іванчэнкаў зрабіў на караблі «Саюз-29» і арбітальнай станцыі «Салют-6» у 1978 годзе.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ А. ГРАМЫКІ

22 чэрвеня 1982 года ў Нью-Йорку адбылася прэс-канферэнцыя члена Палітбюро ЦК КПСС, міністра замежных спраў СССР А. Грамыкі для савецкіх і замежных журналістаў.

У яе пачатку А. Грамыка зрабіў заяву, у якой спыніўся на значэнні сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па раззбраенню. Міністр асабліва падкрэсліў, што рашэнне Савецкага Саюза прыняць на сябе абавязацельства не выкарыстоўваць ядзерную зброю першым мае гістарычны характар. Маюць месца спробы неяк зменшыць значэнне гэтага рашэння. Але неабходна падкрэсліць, што спробы гэтыя зусім беспадстаўныя. Гэта рашэнне Савецкага Саюза будзе запісана ў гісторыі залатымі літарамі.

Калі б іншыя ядзерныя дзяржавы паследавалі прыкладу Савецкага Саюза, ядзерная вайна, страшная пагроза якой навісла над чалавецтвам, была б прадухілена.

Затым А. Грамыка адказаў на пытанні карэспандэнтаў.

НА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ СЕСІІ ААН

ЗА МІР НА ЗЯМЛІ

У агульнай дыскусіі на другой спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па раззбраенню выступіў міністр замежных спраў Беларускай ССР А. Гурыновіч. Ён падкрэсліў, што адной з характэрных рыс агульнай дыскусіі з'яўляецца падзяляемая пераважнай большасцю прамоўцаў заклапочанасць вастрынёй і складанасцю сітуацыі, якая ўзнікла цяпер у свеце па віне сіл імперыялізму і рэакцыі. Над светам навісла небяспека тэрмаядзернага знішчэння ўсёй шматвяковай зямной цывілізацыі. Сілы імперыялізму, якія задаюць тон у блоку НАТО, ажыццяўляюць новыя меры па інтэнсіўнаму нарошчванню стратэгічных узбраенняў, шырокамаштабнай вытворчасці новых разнавіднасцей зброі масавага знішчэння.

Канчатковая мэта гэтых сіл — забяспечыць сабе ваенную перавагу ў свеце. Але народы Еўропы, у тым ліку беларускі народ, якія ў поўнай меры зведалі пакуты і няшчасці вайны, цэняць мір як вышэйшае шчасце і не могуць дазволіць, каб пасля дзесяцігоддзяў мірнага развіцця Еўропа зноў стала «тэатрам ваенных дзеянняў».

Міністр замежных спраў БССР расказаў аб актыўным удзеле грамадскасці Беларусі ў барацьбе за мір, міжнародную бяспеку і раззбраенне.

Дэлегацыя Беларускай ССР будзе канструктыўна садзейнічаць дасягненню гэтай мэты, сказаў у заключэнне А. Гурыновіч.

РЭСПУБЛІКА ЗА МЯЖОЙ

ЗДАДЗЕНА НА ЗАХОЎВАННЕ

У сакратарыят ААН 13 чэрвеня гэтага года здадзена Грамата аб ратыфікацыі Беларускай ССР Канвенцыі аб забароне або абмежаванні прымянення канкрэтных відаў звычайнай зброі, якія могуць лічыцца наносячымі празмерныя пашкоджанні або маючымі невыбіральнае дзеянне, падпісанай ад імя Беларускай ССР у Нью-Йорку 10 красавіка 1981 года. Да ратыфікацыйнай граматы прыкладзена паведамленне на імя генеральнага сакратара ААН аб згодзе на абавязковасць для Беларускай ССР усіх трох пратаколаў да гэтай канвенцыі.

АФІЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ВЫНІКАХ ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

У нядзелю, 20 чэрвеня 1982 года, у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы адбыліся выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў васемнаццатага склікання. Выбраны 6 абласных, 117 раённых, 96 гарадскіх, 25 раённых у гарадах, 111 пасялковых і 1 507 сельскіх Саветаў народных дэпутатаў.

З 6 734 489 унесеных у спісы выбаршчыкаў прыняло ўдзел у галасаванні 6 734 022 чалавекі, або 99,99 працэнта.

Ва ўсе мясцовыя Саветы народных дэпутатаў Беларускай ССР выбрана 85 394 дэпутаты. У ліку дэпутатаў рабочых— 35 137, або 41,1 працэнта, калгаснікаў — 23 702, або 27,8 працэнта, членаў і кандыдатаў у члены КПСС — 36 651, або 42,9 працэнта, беспартыйных — 48 743, або 57,1 працэнта, членаў ВЛКСМ — 18 296, або 21,4 працэнта, жанчын — 42 326, або 49,6 працэнта, дэпутатаў ва ўзросце да 30 гадоў — 28 752, або 33,7 працэнта. Састаў дэпутатаў мясцовых Саветаў абнавіўся на 49,8 працэнта.

З ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

КАМУНІСТЫ ПАРТУГАЛІІ Ў МІНСКУ

У Мінску пабывала дэлегацыя Партугальскай камуністычнай партыі.

Адбылася сустрэча ў ЦК КП Беларусі. Дэлегацыю прыняў сакратар ЦК КПБ Л. Фірысанаў.

Госці з Партугаліі наведалі вытворчае аб'яднанне «Мінскі трактарны завод», дзе азнаёміліся з арганізацыяй вытворчасці, дзейнасцю партыйнай арганізацыі прадпрыемства, з умовамі працы рабочых, сацыяльна-бытавымі і культурнымі аб'ектамі, пабывалі ў Доме-музеі І з'езда РСДРП.

Члены дэлегацыі Партугальскай камуністычнай партыі наведалі таксама калгас імя Гастэлы Мінскага раёна, азнаёміліся з арганізацыяй сельскагаспадарчай вытворчасці, умовамі працы, быту і адпачынку калгаснікаў, пабывалі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на мемарыяльным комплексе «Хатынь», дзе ўсклалі кветкі да Вечнага агню, на Кургане Славы.

ПА ПРАПАНОВЕ АРХІТЭКТАРАЎ

КОЖНАМУ КВАРТАЛУ — СВОЙ СІЛУЭТ

У кожнага новага квартала сталіцы Беларусі — Мінска сваё непаўторнае аблічча. Ды і дамы ў іх прыкметна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Між тым больш за 80 працэнтаў жылля будуецца з серыйных, максімальна уніфікаваных блокаў, сабраных на заводскім канвееры. Нават аблiцоўка панелей керамічнай пліткай пастаўлена на паток.

Але разам з тым будаўнікі шырока вар'іруюць кампаноўку блокаў і секцый, надаючы будынку ўсякі раз новы сілуэт.

Вядзецца таксама пошук і новых тыпавых канструкцый. У прыватнасці, па прапанове архітэктараў у рэспубліцы асвоены масавы выпуск квадратных увогнутых панелей з гладкімі паверхнямі — кясонаў. З-за ігры святла і ценю дамы, пабудаваныя з такіх элементаў, выглядаюць вельмі прыгожа.

Яшчэ большую разнастайнасць надае мікрараёнам спалучэнне нестандартнасці формы жылых будынкаў з творчым пошукам у іх афарбоўцы. Цяпер у Мінску кожны новы жылы масіў мае сваю асноўную колеравую гаму.

СВАЯ ПРАФЕСІЯ — ЦІ ВАРТА ВУЧЫЦЦА ДАЛЕЙ
ЗАРПЛАТА — НЕ САМАМЭТА — ШТО ТРЭБА «ДЛЯ ДУШЫ»

ЯК ЖЫВЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ РАБОЧЫ?

Беларусь (насельніцтва 9,7 мільёна чалавек) — адна з 15 саюзных савецкіх рэспублік. Па велічыні больш, чым Данія, Аўстрыя, Бельгія і Швейцарыя, разам узятыя.

Тут звыш 1 400 буйных вытворчых аб'яднанняў і прадпрыемстваў, больш ста галін прамысловасці.

Адзін з тыповых, на думку мясцовых сацыёлагаў, сучасных заводаў — Гомельскі станкабудаўнічы, вядомы сваёй прадукцыяй — аўтаматычнымі і паўаўтаматычнымі станкамі і абсталяваннем — у 56 краінах. Па выніках працоўнага спаборніцтва апошніх пяці гадоў ён стаў адным з вядучых у галіне. Статыстыкі дапамаглі выбраць сярэдняга тыповага рабочага.

РАБОЧЫ БЕДРЫКАЎ ВЫБРАЎ ПРАФЕСІЮ

Бедрыкаў Анатоль Васільевіч, 1939 года нараджэння. Стругальшчык першага механічнага цэха Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава. Працуе на заводзе з 1963 года. Мае высокі разрад. Мясцовыя статыстыкі адносяць яго да сярэдніх — і па кваліфікацыі, і па заработку, і па занятках грамадскай працай. Ён не герой, не лаўрэат. Падобных на яго тут большасць. У ліку яшчэ 117 рабочых узнагароджаны ордэнам: датэрмінова выканаў асабістае вытворчае заданне пяцігодкі (1976—1980 гады) за чатыры гады сем месяцаў. Беспартыйны, атэіст. На думку таварышаў, чалавек працавіты, валявы.

Бедрыкаў закончыў сярэднюю школу ў Гомелі ў сярэдзіне 50-х гадоў. Тады сярэднюю поўную адукацыю атрымліваў толькі адзін з 18—20 юнакоў і дзяўчат. У 60-я гады кожны навічок на падобнай вытворчасці ўжо меў такую адукацыю. Цяпер, у 80-я гады, яе маюць практычна ўсе працуючыя. Выраішыў паспрабаваць здаць экзамены ў інстытут, але па конкурсу не прайшоў. Быў прызваны ў армію. Калі дэмабілізаваўся, на прадпрыемствы і будоўлі ўжо масай ішлі выпускнікі сярэдніх школ. Ад настаўнікаў яны ўспрымалі важную ісціну: перш чым задаць сабе пытанне, кім быць, пацікаўцеся ў грамадства: хто цяпер больш патрэбны? Былыя школьнікі разумелі: трапіш туды, дзе ты больш патрэбны, — хутчэй, ярчэй і паўней раскрыецца для грамадства твая асоба, хутчэй прыйдзе поспех. І Бедрыкаў пайшоў туды, на Гомельскі станкабудаўнічы. У аддзеле кадраў сказалі: «Больш за ўсё заводу патрэбны стругальшчыкі, заработак добры». І ён стаў неўзабаве стругальшчыкам. Знайсці сваё месца дапамагалі пачуццё абавязку, шырокі кругагляд.

Рабочую спецыяльнасць атрымаў непасрэдна на заводзе і паступова палюбіў яе, палюбіў працу рабочага, свой завод. І ўжо не шкадаваў, што не прайшоў у інстытут па конкурсу, бо выбіраў ён тады прафесію **не сваю.**

Для кожнага савецкага чалавека права на выбар прафесіі, род заняткаў, работы замацавана ў Канстытуцыі.

Бедрыкаў крыху зайздросціць: цяпер свядомы выбар прафесіі аблягчаецца прафесійнай арыентацыяй у школе. На завод, дзе ён працуе, прыходзяць навічкі, якія не толькі выдатна ведаюць тэорыю, але і маюць навыкі работы на тым або іншым станку. Яны прайшлі падрыхтоўку ў сістэме прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, маюць агульнаадукацыйны і тэхнічны кругагляд, аснову для росту дзелавой кваліфікацыі, стымул да духоўнага росту. Нямала сярод іх і такіх, чые бацькі і браты ўжо многа гадоў працуюць на заводзе: для іх выбар працы рабочага — сямейная **традыцыя.**

Сацыёлагі падлічылі, што выбраўшыя спецыяльнасць у выніку прафесійнай арыентацыі прыкметна лепш выконваюць зменныя заданні, у іх меншы працэнт браку. Яны задаволены сваёй працай і звычайна не мяняюць яе. Выпускнікі прафтэхвучылішчаў могуць дасягаць майстэрства для атрымання чарговага разраду ў тры-чатыры разы хутчэй, чым звычайны рабочы.

ЧАМУ БЕДРЫКАЎ ІМКНЕЦЦА ПАВЫШАЦЬ СВАЕ ВЕДЫ

Што разумее Бедрыкаў пад словамі «праца кваліфікаванага рабочага»? Развітыя да віртуознасці і набытыя шматгадовай практыкай вузкаспецыялізаваныя навыкі? Так. Але ён лічыць, што ва ўмовах 80-х гадоў неабходны агульная адукаванасць, тэарэтычная падрыхтоўка, рознабаковы запас спецыяльных ведаў аб прадметах і сродках працы. Значна змяніліся і суадносіны паміж фізічнымі і разумовымі намаганнямі рабочага на карысць апошніх.

Сацыёлагі падлічылі, што ў Бедрыкава за 19 гадоў работы ў першым механічным цэху змянілася шэсць мадэлей станкоў, якія раз-пораз удасканальваліся. Кожная новая мадэль патрабавала больш высокай падрыхтоўкі і грунтоўных ведаў.

Гомельскі завод да ліку поўнасцю аўтаматызаваных прадпрыемстваў не аднясеш. Але ён рэканструюецца. Ужо цяпер у выніку механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў ступень ахопу рабочых механізаванай працай складае ў асноўнай вытворчасці — 92 і ў дапаможнай — 82 працэнты.

Аснова цяперашняй вытворчасці ў СССР — рабочыя з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Ужо ёсць рабочыя і з вышэйшай адукацыяй. У бліжэйшыя дзесяцігоддзі яшчэ больш хуткімі тэмпамі пойдзе працэс сціхання істотнай розніцы паміж фізічнай і разумовай працай, яшчэ больш узмоцніцца працэс фарміравання ў кожнага працуючага здольнасці да творчай дзейнасці.

У перспектыве, як лічыць Бедрыкаў, яму прыйдзецца, магчыма, увогуле расстацца са сваім падоўжна-стругальным станком. Аўтаматыка скажа сваё слова. Інтарэсы вытворчасці патрабуюць, каб рабочыя мелі сумежныя спецыяльнасці. Так думаюць многія на заводзе. І таму тут створаны бясплатныя курсы навучання іншым прафесіям. Бедрыкаў ужо асвоіў спецыяльнасць расточніка. Каб не адставаць ад патрабаванняў часу, як і большасць рабочых, павышае кваліфікацыю на вытворчых тэхнічных курсах, у школе па вывучэнню перадавых метадаў працы, эканамічнай школе.

Бедрыкаў — настаўнік моладзі (адзін з яго вучняў — Віктар Сікора стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі), камандзір добраахвотнай народнай дружыны цэха па ахове грамадскага парадку ў горадзе і член цэхавага савета прафілактыкі правапарушэнняў. Як член заводскага Савета рацыяналізатараў і вынаходнікаў, ён удзельнічае ў стварэнні норм працы на заводзе.

ЧЫМ РАБОЧЫ ЦІКАВІЦЦА

Бедрыкаў задаволены сваім заработкам, але не лічыць яго самамэтай. Трэба, каб гэта не перашкаджала нармальнаму развіццю рознабаковых інтарэсаў, існуючаму рытму жыцця.

Яго жонка — Надзея Кузьмінічна — старшы бухгалтар. Мае сярэднюю спецыяльную адукацыю, працуе ў абкоме прафсаюза работнікаў лясной прамысловасці. Гадавы даход сям'і Бедрыкавых з 1973 па 1981 год вырас на 60 працэнтаў (за кошт росту зарплаты, павышэння кваліфікацыі Бедрыкава і яго жонкі, павелічэння льгот і да т. п. Цэны на асноўныя тавары і паслугі ў СССР застаюцца стабільнымі многія гады). У іх ёсць дачка Святлана (17 гадоў), хутка скончыць сярэднюю школу. Галоўная крыніца сямейнага бюджэту — зарплата бацькоў. Але вельмі істотную ролю адыгрываюць і выплаты з грамадскіх фондаў спажывання. На Бедрыкава дзяржава выдаткавала, напрыклад, у 1980 годзе значную суму з фондаў грамадскага спажывання. За год ён 48 дзён адпачываў у заводскім прафілакторыі, 20 дзён знаходзіўся ў Чэхаславакіі па турысцкай пуцёўцы. Яго дачка Святлана 26 дзён адпачывала ў заводскім пансіянаце. Яе абучэнне ў сярэдняй школе для Бедрыкава бясплатнае, усё аплачваецца дзяржавай.

Цяпер праблема жылля і дзіцячых садоў на заводзе поўнасцю вырашана: кожны трэці працуючы за дзесяць апошніх гадоў палепшыў жыллёвыя ўмовы. У Бедрыкава кватэра двухпакаёвая, атрымана ад завода. Плата за кватэру, тэлефон, камунальныя паслугі — менш трох працэнтаў ад заработнай платы. Сённяшні рацыён харчавання сям'і Бедрыкавых складаецца амаль з 50 назваў розных прадуктаў. Аўтамабіль, тэлевізар, дасканалая радыёсістэма і іншыя прадметы быту ў сям'і ёсць. Гаспадыня гаворыць: «Для нас рэчы — не самамэта, не культ. Мы купляем не тое, што падабаецца, а тое, што неабходна».

У сям'і цікавяцца многім. Тут ужо некалькі гадоў запар выпісваецца да 12 розных газет і часопісаў. У паўтара раза за апошнія пяць гадоў выраслі пакупкі сям'ёй кніг. Растуць расходы на наведванне тэатраў, канцэртных залаў.

Як любіць праводзіць гэтая сям'я вольны час? Паездкі ў лес за грыбамі, ягадамі. Сумесныя турысцкія паездкі па вобласці, рэспубліцы, па іншых месцах СССР. Любяць музыку, асабліва Шапэна, Моцарта, Чайкоўскага, Рахманінава. Дачка вучыцца яшчэ і ў музычнай школе. Вечарамі часта збіраюцца паслухаць запісы, новыя пласцінкі, пачытаць вершы. Разам глядзяць і перадачы тэлебачання з Гомеля, Мінска і Масквы. Многа чытаюць. А ўвогуле — жывуць, як многія ў Гомелі.

Уладзімір КРЫЛОЎ,
кандыдат эканамічных навук.



САЛІГОРСК

Харчовая праграма СССР прадугледжвае ў 1985 годзе даць сельскай гаспадарцы 26,5 мільёна тон мінеральных угнаенняў, у 1990 —30—32 мільёны тон, а таксама хімічных кармавых дабавак адпаведна 950 тысяч тон і 1,2 мільёна тон. Вялікую долю гэтых паставак выканае калектыў вытворчага аб'яднання «Беларускалій». Днём і ноччу з нетраў салігорскай зямлі ідзе на-гара сільвініт — амаль мільён тон кожны тыдзень. Выраблене з яго ўгнаенне паступае ў многія саюзныя рэспублікі, экспартуецца ў сацыялістычныя краіны, а таксама ў Італію, Галандыю, Індыю і іншыя.

Салігорску ўжо амаль чвэрць стагоддзя. Ён расце, прыгажэе. Штогод тут будуецца больш за 50 тысяч квадратных метраў жылля. Адна з прыкмет горада — маладосць яго жыхароў. У Салігорску свой горнахімічны тэхнікум, які выпусціў 4 тысячы спецыялістаў. Сёння на завочным і вячэрнім аддзяленнях гэтай установы вучацца 1 100 юнакоў і дзяўчат.

НА ЗДЫМКАХ: новыя дамы ў Салігорску; галоўны архітэктар горада Станіслаў ТКАЧЭНКА (у цэнтры) абмяркоўвае праект новага дома з галоўным інжынерам домабудаўнічага камбіната Генадзем САНЬКО і галоўным інжынерам будаўнічага ўпраўлення № 122 Аляксеем КУЗЬМІНЫМ; рэпеціруе танцавальны ансамбль «Іскарка».

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ПРА ШТО РАСКАЗАЛІ ПІСЬМЫ З СІЯНІСЦКАГА «РАЮ»

У сумным эміграцыйным спісу Я. Шлякман далёка не першы. І хоць гэты былы савецкі ўрач быў знаёмы з многімі сведчаннямі бессаромнага, жорсткага падману занадта даверлівых людзей сіяніскай прапагандай, тым не менш пакінуў сям'ю ў СССР і падаўся ў Ізраіль, песцячы сябе вялікімі надзеямі прыпасці да малочных рэк і кісельных берагоў «вольнага і багатага свету».

І што ж з гэтага выйшла?

Пінчанін М. Перчык, з якім перапісваецца Я. Шлякман, пачынае свой расказ з такіх слоў:

— Вы спытаеце ў мяне, навошта я іду сёння ў горад, і я вам адкажу. Але гэта потым. А пакуль пачытайце вось гэтыя пісьмы...

І ён прапанаваў некалькі канвертаў з ізраільскімі паштовымі маркамі. Калі б гэтыя пісьмы паказалі графолагу, ён напэўна зрабіў бы вывад, што напісаны яны ў стане вялікага душэўнага разладу. І дзіўная справа — чым далей учытваешся ў паспешныя радкі, тым больш пераконваешся: падобныя споведзі ўжо даводзілася чуць. Трагедыі гэтых людзей, падманутых і падмануўшых сябе, пры ўсіх нюансах даволі-такі падобныя.

Параўнаем хоць бы выказванні тых, хто спазнаў і адваротны бок абяцанага ім «раю».

...Брэст. АВІР — аддзел віз і рэгістрацый. Сюды раз-пораз заходзяць для афармлення адпаведных дакументаў людзі, што адпраўляюцца за мяжу, або, наадварот, прыбыўшыя з-за мяжы. Давыдовічы, якія стомлена размясціліся на крэслах, — адны з нямногіх, каму ўдалося вырвацца з Ізраіля. Расказвае Соф'я Давыдовіч, выпускніца Беларускага дзяржаўнага універсітэта:

«У Ізраілі інтэлігенты, якія эмігравалі з СССР, увогуле не знаходзяць прымянення сваім сілам. Пазнаёміліся неяк з сям'ёй паэта-нябожчыка Галкіна. Жонка Міля — скульптар, дачка Тамара — мастачка. Але таленты іх нікому не патрэбны. Чым жыць? Спачатку спадзяваліся перавыдаць прывезеныя з сабой вершы. Але дарэмна. «Дык чаму ж эмісары вашы тады ўнушалі нам наконт новага росквіту літаратуры і мастацтва ў Ізраілі?» — насядала Міля на выдаўцоў. Адказам быў пагардлівы погляд — і дзверы зачыняліся.

У Тэль-Авіве ўпершыню ў жыцці я адчула трывогу за будучае майго сына. Адукацыю ён не змог бы атрымаць, бо пасля васьмі класаў за вучобу трэба плаціць вялікія грошы. А як іх назбіраць? Нават на сярэднеаплатную работу не было надзеі. Мы бачылі, як людзі пакутуюць ад беспрацоўя. Прыезд кожнага эмігранта выклікае новы прыліў варожасці ў карэнных жыхароў, бо эмігрант гатовы працаваць за самую нізкую плату...»

І. Бурштэйн — калега Шлякмана, урач-неўрапатолаг. Ён адрасаваў свайму знаёмаму ў СССР пісьмо, дзе былі і такія радкі:

«Прыбыўшы на «запаветную зямлю», я ўбачыў і зведаў такое, што цяжка перадаць, што не прысніцца ў сне пры самай багатай фантазіі... Падман у краіне небывалы, суперпадман. Гэта тут рухаючы фактар. З моманту, калі твая нага ўпершыню ступае на зямлю гэтай краіны, ты трапляеш у кабалу, становішся даўжніком. Ты пачінен вярнуць грошы за пералёт у Ізраіль, за дастаўку багажа. Калі ты, на няшчасце, маеш вышэйшую адукацыю, то цябе накіроўваюць на курсы па вывучэнню мовы іўрыт, пасля заканчэння якіх ты зноў даўжнік: абавязаны выплаціць акадэмічны падатак за вучобу на працягу чатырохпяці месяцаў, і гэты падатак складае немалую суму. Закончыўшы вучобу на курсах, будзь ласкавы, вызвалі неадкладна памяшканне, дзе ты жыў гэты перыяд з сям'ёй або адзін, незалежна ад таго, ёсць у цябе кватэра ці няма, ёсць работа або не...»

А вось споведзі пра ізраільскі «рай» і самога Я. Шлякмана:

«З копіяй дыплома аб заканчэнні медыцынскага інстытута і з пачуццём дапытлівасці і цікаўнасці пакінуў я межы СССР у 1973 годзе і вось ужо многа гадоў жыву ў чужой дзяржаве...

У тым горадзе, дзе мне далі жыллё, мяне на работу не прынялі. Нават удалечыні ад дому ўзялі толькі часова («Няма ставак, можна толькі на стаўку ад Сохнута» — тэль-авіўскай арганізацыі, якая ведае іміграцыйнымі справамі). З заканчэннем пэўнага тэрміну мяне звальнялі і тут жа бралі зноў. Гэта рабілася для таго, каб я не атрымаў «статуса пастаянства», калі звальненне з работы абавязвае выплачваць кампенсацыю. А ў адной прыватнай бальніцы пісьмовага дагавора і зусім не складалі...

Я спазнаў цяпер на ўласнай скуры, што сіяніскія ідэалы былі рэакцыйныя нават на пачатку іх узнікнення, а цяпер сіянізм — ланцужны сабака аджываючай эпохі імперыялізму.

Да вас, родныя, звяртаюся з завяшчаннем: памятайце, што ідэя аб зборы ўсіх яўрэяў у Ізраіль ганебная ў сваёй аснове.

Жыццё маё ў тутэйшых краях невыноснае. Часам і не веру, што некалі я быў урачом, паважаным чалавекам і спецыялістам. Такое пачуццё, што нашага брата-эмігранта сіяніскія арганізацыі выкарыстоўваюць як пешак у сваёй вялікай і небяспечнай гульні, як рэштавую манету...»

Свае прызнанні былы ўрач заканчвае прыпіскай: «Не буду супраць, калі пісьмо апублікуюць з указаннем майго дакладнага адраса: Шлякман Якаў Вульфавіч, п/с 179, К. Мотцкін, Ізраіль».

На што ж цяпер жыве гэты чалавек, які добраахвотна адрокся ад Радзімы? Пісьмы Шлякмана каменціруе М. Перчык:

— Паколькі на ідзіш і на рускай мове ў Ізраілі гаварыць забараняецца, Якаву давялося пяць месяцаў вывучаць іўрыт. Значыць, усе гэтыя месяцы жыў у доўг. Расплачваўся мізэрнымі заробкамі ў розных клініках. Грошай ледзь хапала на тое, каб разлічыцца за абеды ў харчэўні. Але калі Якаў заявіў афіцыйна аб сваім жаданні вярнуцца ў СССР, яго тут жа сталі ўсяляк цкаваць, аб'явілі вар'ятам. Апошнім часам ён дворнікам працаваў. Рады быў, што даюць за гэта бясплатнае сненданне. Еў адзін раз у суткі. Такія справы...

На мінуту замоўкнуўшы, М. Перчык згадвае пачатак нашай размовы:

— Я абяцаў вам сказаць, навошта я накіроўваюся сёння ў горад. Якаў просіць сваякоў прыслаць сшыткі. Звычайныя школьныя сшыткі.

Навошта яны Шлякману патрэбны, высветлілася пазней. Сшыткі там даражэйшыя, чым у нас. Ён імі і гандлюе. На гэта і жыве, таму што гаспадар адмовіўся ад яго паслуг дворніка...

Так добраахвотна Шлякман і іншыя асудзілі сябе на пакуты ў чужым краі. У паводзінах такіх людзей назіраецца нават пэўная схема: спачатку, клюнуўшы на вуду зазывал з Тэль-Авіва, яны і слухаць не хочуць перасцярог («Не куды-небудзь едзем — на «зямлю запаветную», і быць там шчасцю нашаму!»), затым — першыя расчараванні («Прывыкнуць да новага ладу жыцця неверагодна цяжка, ды наўрад ці магчыма»), потым — нясмелыя надзеі («Авось усё ўладкуецца, жывуць жа неяк іншыя»), а праз месяцы — горкія расчараванні («Мы на зямлі прабацькоў — чужыя сярод чужых»).

Калі характарызаваць адным словам акцыю, якую вяршаць заправілы з Сохнута, то гэтым словам будзе такое — суперпадман. Нават такая высакародная справа, як уз'яднанне з сем'ямі, што мае ў сваёй аснове гуманнасць, падмацаваную рознымі міжнароднымі законамі, у Ізраілі носіць пераважна падманны, а дакладней сказаць, жульніцкі характар.

Жульніцтва заключаецца ў тым, што многія савецкія грамадзяне яўрэйскага паходжання атрымліваюць з Ізраіля візы на права ўезда ў гэтую краіну, у іх указваюцца прозвішчы сваякоў, якіх няма і ў паміне. Прасцей кажучы, ліпа. Вырабляюць гэтую ліпу канвеерным спосабам, каб пабольш людзей падмануць.

І пакуль Шлякман і да яго падобныя праліваюць горкія слёзы ў сваіх пісьмах з «раю», сіяніскі канвеер працягвае штампаваць выклікі-запрашэнні. Адзін такі выклік прынёс у рэдакцыю жыхар горада Брэста, афіцэр запасу Г. Звераў. Абураны нахабствам ізраільскіх вярбоўшчыкаў, ён сказаў:

— Ніякіх сваякоў у мяне ў Ізраілі няма. Гэта фальшыўка.

Фальшыўка выглядала даволі ўнушальна. Дазвол на ўезд пад нумарам 10/0744 завераны пячаткай Міністэрства замежных спраў у Іерусаліме. Ашаломленаму брэсцкаму паведамлялася наступнае:

— Паважаны Пан/Пані.

Згодна з вашай просьбай маю гонар паведаміць Вам ад імя Міністэрства Замежных Спраў, што пералічаным асобам будзе дазволены ўезд у Ізраіль у якасці імігрантаў. Візы будуць выдадзены, калі не акажацца медыцынскай альбо іншай перашкоды, адным з дыпламатычных або консульскіх прадстаўніцтваў Ізраіля заграніцай (так у тэксце — **рэд.**) толькі асобам, што едуць на сталае жыхарства ў Ізраіль».

Тут жа ўказваецца і адрас «сваякоў»: Пелед Уры, вул. Мелхемет. Йом Кіпур, 302/13. Маалот, Ізраіль.

Да «Дазволу на ўезд» прымацавана пасведчанне з пячаткамі натарыўса і сам «выклік», які быў выкананы друкарскім шрыфтам:

«Сапраўдным звяртаюся да адпаведных кампетэнтных Савецкіх Улад з вялікай просьбай аб выдачы маім сваякам дазволу на выезд да мяне ў Ізраіль на сталае жыхарства.

Я і мая сям'я матэрыяльна добра забяспечаны і маем усе сродкі для прадастаўлення маім родным усяго самага неабходнага з дня прыезду да нас.

Улічваючы гуманныя адносіны Савецкіх Улад да пытання аб'яднання разрозненых сямей, спадзяюся на станоўчае вырашэнне маёй і маіх родных просьбы, за што загадзя дзякую».

Вольны роспіс павінен быў сведчыць, што падпісаў выклік нейкі Пелед Уры.

— Не ведаю і не хачу ведаць, хто такі гэты Пелед Уры, — гаворыць Г. Звераў. — І нішто мяне не родніць з Ізраілем. Я нарадзіўся ў Краіне Саветаў. У гэтым годзе, у Дзень Перамогі, я адзначыў сваё пяцідзесяцігоддзе. Здарылася так, што мае бацькі (бацька служыў пагранічнікам у Гродна) загінулі ў першы ж дзень вайны. Што чакала мяне, дзевяцігадовага сірату? Але навокал былі савецкія людзі, яны не далі мне памерці з голаду. Знайшоў я прытулак у адной з воінскіх часцей, стаў сынам палка. Так усю вайну прайшоў — ад Сталінграда да Патсдама. Аб тым грозным часе нагадвае мне медаль «За адвагу». А пасля вайны клапатлівыя бацькі-камандзіры накіравалі мяне ў Ленінградскае суворaўскае вучылішча. Потым была акадэмія. Словам, Савецкая краіна дала мне ўсё, і ўсё сваё жыццё я імкнуўся верай і праўдай служыць ёй. І, натуральна, нават думкі не было ў мяне такой кашчуннай — здрадзіць свайму народу, які выгадаваў і выхаваў мяне. Цяпер я працую выкладчыкам фізкультуры ў сярэдняй школе № 1 горада Брэста. Дзеці любяць мяне, я люблю дзяцей.

Дарэмна стараюцца паны з Сохнута, — працягвае Г. Звераў. — Не заманіць ім мяне ў пастку! Не хачу, каб, як гэта здарылася з некаторымі нашымі падманутымі суайчыннікамі ў Тэль-Авіве, на мяне паказвалі пальцам і гаварылі: «Паглядзіце на гэтых няшчасных замучаных савецкіх яўрэяў. Яны ў жыцці сваім не елі памідораў і белага хлеба». Хопіць! Ёсць у нас і хлеб і ўсё, што трэба. А яшчэ ёсць вялікае і святое, чаго няма там — дружба, таварыскасць, узаемадапамога.

Вы ў сябе ў Ізраілі нават яўрэяў падзяляеце на касты. А ў нас, у СССР, усе нацыі, усе народнасці роўныя. Гэтага ад нас нікому не адняць! І не трэба ратаваць нас, як вы гаворыце, з «сацыялістычнага пекла», мы ў сваёй краіне шчаслівыя і ганарымся ёю. Выратуйце сябе, паны зазывалы, ад гневу падманутых вамі людзей. Вось такі мой адказ тым, хто сфабрыкаваў непатрэбны ні мне, ні членам маёй сям'і выклік на так званую «зямлю запаветную».

А. ЛЕАНАВЕЦ.
(«Заря»).

«КАЗАЧНЫ ЗАМАК» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ



Новае кафэ для дзяцей «Казачны замак» гасцінна расчыніла дзверы. Яно адкрыта на Ленінскім праспекце ў Мінску. Тут дзятва можа ўбачыць герояў сваіх любімых казак, яе чакаюць незвычайныя пачастункі — кактэйль «Сонейка», салат «Сіньёр-памідор», біфштэкс «Тры таўстуны» і іншыя смачныя стравы. Новае кафэ спадабалася дзецям.

НА ЗДЫМКАХ: ля ўваходу ў новае кафэ; добрая фея — афіцыянтка Вольга ЛАГУТА; у зале «Казачнага замка».

Фота В. ВІТЧАНКІ.

Што? * Як? * Чаму?

Настала лета. Ціха ў школьных класах і калідорах. Апусцелі двары і пляцоўкі. Нават у гарадскіх парках і скверах радзей чуецца дзіцячы гоман. Час адпачынку. Выехалі на дачы яслі і сады. Звыш 25 тысяч дзяцей пабывае сёлета з бацькамі ў дамах адпачынку, на турбазах, у санаторыях і пансіянатах. Але больш за ўсё школьнікаў выехала ў

ПІЯНЕРСКІ ЛАГЕР

Нашы зямлячкі, якія да вайны жылі на Радзіме, часта расказваюць дзецям і ўнукам, як цікава і радасна праводзілі яны свае летнія канікулы. У іх памяці захаваліся паходныя палаткі, пастаўленыя на беразе возера, рэчкі, піянерскія кастры, дзе на вуголлях пяклася бульба, дзе дапазна спявалі песні, вадзілі карагоды.

І цяпер весела і цікава праводзяць свой адпачынак у піянерскіх лагерах нашы школьнікі. І ўсё ж вельмі многае змянілася. Саміх піянерскіх лагераў стала значна больш, чым было да вайны. Сёлета прафсаюзы рэспублікі адкрылі іх амаль чатыры тысячы. Адпачне ў іх за лета каля паўмільёна дзяцей, гарадскіх і сельскіх. І палатак цяпер ужо, бадай, не знойдзеш. На берагах тых жа рэчак і азёраў, у самых маляўнічых, самых зручных месцах будуюцца гарадкі, у якіх добраўпарадкаваныя жылыя карпусы, сталовая, клуб, медыцынскі пункт, што часта нагадвае паліклініку ў мініяцюры, спартыўныя пляцоўкі, басейн.

У некалькіх піянерскіх лагерах пад Мінскам на працягу дваццаці гадоў адпачывалі многія дзеці нашых землякоў з розных капіталістычных краін, а цяпер прыязджаюць ужо іх унукі. Не раз за гэты час даводзілася чуць ад суайчыннікаў: «Такіх умоў для адпачынку дзяцей, як у вас, мы не маем. Нічога падобнага на вашы піянерскія лагеры ў нас, на жаль, няма».

Летні адпачынак, калі бацькі хочуць адправіць сына альбо дачку за горад, на прыроду, ні для каго не з'яўляецца праблемай. Амаль поўнасцю ўсе расходы бярэ на сябе дзяржава. Вось, напрыклад, сёлета з прафсаюзнага бюджэту і бюджэту сацыяльнага страхавання на арганізацыю адпачынку піянераў і школьнікаў у рэспубліцы будзе выдаткавана пятнаццаць з паловай мільёнаў рублёў. Дзеці ў лагеры атрымліваюць чатырохразовае харчаванне, жывуць у прасторных, светлых пакоях, карыстаюцца ўсімі спартыўнымі прыладамі, стадыёнам або спартыўнай пляцоўкай, басейнам, у кожным піянерскім атрадзе ёсць педагог і піянер-важаты. Бацькі за такую пуцёўку плацяць толькі пятую частку яе поўнага кошту (прыкладна 12—14 рублёў за месяц), астатнія расходы бяруць на сябе прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі. Мнагадзетныя сем'і і нізкааплачваемыя рабочыя атрымліваюць наогул бясплатныя пуцёўкі.

Акрамя таго, што дзеці ў піянерскім лагеры накормлены, дагледжаны, ім яшчэ і проста цікава там. Летам без школы, сяброў, пэўных заняткаў яны засумавалі б. А калі падлетку сумна, ён ідзе часам на вуліцу. І тут цяжка бывае прадказаць, на якія справы скіруе ён сваю фантазію. У піянерскім лагеры ў дзяцей самыя розныя заняткі, адпавядаючыя іх узросту, схільнасцям, запатрабаванням. Гульні, спартыўныя спаборніцтвы, паходы, вечары цікавых сустрэч — гэта звычайна для ўсяго лагера або асобнага атрада. Але ёсць яшчэ і самыя розныя гурткі, якія аб'ядноўваюць мастакоў ці разьбяроў, вышывальшчыц або швачак, танцораў ці спевакоў. Кіруюць гурткамі людзі дасведчаныя, здольныя навучыць, даць параду. Работы юных майстроў звычайна экспануюцца на выстаўках у лагеры, а «артысты» даюць канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Ёсць у нас яшчэ і піянерскія лагеры санаторнага тыпу. Туды, як правіла, накіроўваюцца дзеці, якія маюць патрэбу не толькі ў адпачынку, але і ў лячэнні. У такіх лагерах штат медыцынскіх работнікаў значна большы, і лячэнне ў іх спалучаецца з рознымі цікавымі мерапрыемствамі. Знаходжанне ў лагеры санаторнага тыпу падоўжанае ў параўнанні са звычайным піянерскім лагерам. За лета ў лагерах бывае звычайна тры змены. Многія маюць магчымасць узяць пуцёўку на два або нават тры месяцы. За гэты час дзеці добра адпачнуць, паправяць здароўе і з новымі сіламі пачнуць навучальны год.

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

З нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа ў ПНР прайшлі Дні беларускай літаратуры. Ва ўрачыстай сустрэчы ў Варшаўскім Доме польска-савецкай дружбы ўдзельнічалі сярод іншых прафесар-мовазнаўца Леў Шакун і паэт і літаратуразнаўца Алег Лойка з Беларускага дзяржуніверсітэта, а таксама дацэнт Уладзімір Казьбярук з Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР.

Намеснік старшыні галоўнага кіраўніцтва Таварыства польска-савецкай дружбы Юзэф Озга-Міхальскі сказаў цёплыя словы пра творчасць вялікіх песняроў, расказаў пра мінулае і сучаснае беларускай літаратуры і яе ўклад у сусветную культурную скарбніцу. У. Казьбярук гаварыў пра беларуска - польскія літаратурныя сувязі і пераклады твораў польскіх пісьменнікаў на беларускую мову. Л. Шакун інфармаваў аб мовазнаўчых працах у рэспубліцы, аб выданні вялікіх дыялектычных слоўнікаў (у БССР неўзабаве выйдзе з друку беларуска-польска-літоўскі слоўнік моўнага памежжа).

Грамадскасць Польшчы шырока адзначае 100-гадовы юбілей Янкі Купалы і Якуба Коласа. У краіне праходзяць шматлікія літаратурныя вечары, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, наладжваюцца выстаўкі кніг.

Лодзінскае выдавецтва выдала том выбраных вершаў Я. Купалы, рыхтуецца выбранае Я. Коласа. Часопіс «Літэратура на сьвеце» прысвяціў беларускай літаратуры цэлы нумар. Творы вялікіх паэтаў прагучаць таксама на XIII Агульнапольскім конкурсе чытальнікаў рускай і савецкай паэзіі і прозы.

ПРЫСВЕЧАНА 60-ГОДДЗЮ СССР

«Савецкая Беларусь» — так называецца выстаўка, што адкрылася ў сталіцы Малайзіі Куала-Лумпуры з нагоды 60-годдзя ўтварэння СССР.

Шматлікія фатаграфіі расказваюць аб слаўным шляху, пройдзеным Беларуссю за гады Савецкай улады, сённяшніх дасягненнях рэспублікі ў эканамічнай, навуковай, культурнай і іншых галінах.

У экспазіцыі, разгорнутай у савецкім культурным цэнтры, прадстаўлены таксама прадметы прыкладнога мастацтва, выкананыя беларускімі народнымі ўмельцамі — ганчарамі, рэзчыкамі па дрэву, ткачыхамі.

Горад Гомель — адзін з абласных цэнтраў рэспублікі.

НИКАКОГО САМОУПРАВСТВА, НИКАКОГО НАСИЛИЯ

НАЦИОНАЛЬНЫЕ ОТНОШЕНИЯ И РЕЛИГИЯ В СССР

Решение национального вопроса в Советском Союзе было самым тесным образом связано с осуществлением свободы совести. Дело в том, что в России до победы в 1917 году социалистической революции религия использовалась царским правительством для разжигания межрелигиозной розни, что вело к межнациональной вражде. Государственной религией в стране являлась Русская православная церковь. Это означало, что лица всех других вероисповеданий, а также неверующие граждане ограничивались в правах и подвергались дискриминации. Велись гонения на национальную культуру «иноверцев», их обычаи и нравы. Нетерпимость к «неверным» оборачивалась, по сути дела, враждебным отношением к целым народам. Вопрос уравнения в правах всех народов и наций независимо от их расовой и религиозной принадлежности стал принципиальным для первого в мире социалистического государства.

«Декларация прав народов России», принятая Советским правительством в ноябре 1917 года, отменила все национальные и религиозные привилегии и ограничения, деление существующих в стране религий на «господствующую», «терпимые и нетерпимые». Навсегда исключалась из общественной жизни страны политика разделения народов на «высшие» и «низшие», натравливание их друг на друга на религиозно-национальной почве.

Глава Советского правительства Ленин подписал Обращение «Ко всем трудящимся мусульманам России и Востока», объявлявшее свободными и неприкосновенными верования и обычаи, национальные и культурные учреждения всех народов страны. Примером уважения Советской властью религиозных верований населения национальных районов России явилась передача мусульманам одной из древнейших и редчайших рукописей — корана Османа, изъятого в XIX веке из одной среднеазиатской мечети царским генералом. Солдаты-мусульмане после падения в феврале 1917 года царского правительства пытались даже силой захватить этот коран, хранившийся тогда в столице России Петрограде, но Временное буржуазное правительство жестоко расправилось с ними. После установления Советской власти мусульмане обратились к рабоче-крестьянскому правительству с просьбой возвратить им эту священную для них рукопись. Правительство приняло специальное постановление за подписью Ленина о немедленной передаче им корана Османа. Эта реликвия хранится ныне в Ташкенте — столице Советского Узбекистана.

Идея равенства всех религий перед государством получила дальнейшее развитие в разработанном непосредственно под руководством Ленина декрете «Об отделении церкви от государства и школы от церкви», принятом в 1918 году. В нем подчеркивалось, что государство не подвергает ни одно вероисповедание каким-либо ограничениям — все они имеют равные права. Это явилось глубоко гуманным актом и с большим удовлетворением было встречено всеми национальностями Советской России.

Идея полного равноправия граждан независимо от отношения к религии стала конституционной нормой в СССР. Советские конституции 1918, 1924, 1936, 1977 годов неизменно закрепляли ее в своих статьях. Статья 52 ныне действующей Конституции гарантирует гражданам СССР свободу совести, то есть «право исповедовать любую религию или не исповедовать никакой, отправлять религиозные культы или вести атеистическую пропаганду». Она включает в себя и такую формулировку: «Возбуждение вражды и ненависти в связи с религиозными верованиями запрещается». Это означает законодательное закрепление достижений советского общества в области национальных и религиозных отношений и направлено на защиту прав личности независимо от отношения к религии. В статье 34 Конституции сказано: «Граждане СССР равны перед Законом независимо от происхождения, социального и имущественного положения, национальной и расовой принадлежности, пола, образования, языка, отношения к религии... Равноправие граждан СССР обеспечивается во всех областях экономической, политической, социальной и культурной жизни».

В соответствии с конституционными нормами в Советском Союзе в настоящее время действует свыше 20 тысяч религиозных объединений. В СССР, где подавляющее большинство населения стоит на материалистических позициях, свободно действуют объединения более 40 религий.

В своей внутренней деятельности религиозные объединения не зависят от государственных органов, действуют как совершенно свободные союзы граждан-единомышленников.

Граждане ряда национальностей, населяющих в основном Среднюю Азию, Кавказ, Казахстан, районы Сибири и Поволжья, исповедуют ислам. Религиозной жизнью мусульманских общин руководят четыре духовных управления, избираемые самими верующими.

Мусульмане готовят служителей культа в своих учебных заведениях — медресе и мусульманской академии в Ташкенте. Пополняют теологическое образование мусульмане из СССР в исламских университетах арабских стран.

Свои самостоятельные центры для руководства религиозной деятельностью имеют буддисты, грузинская православная, лютеранско-евангелическая, реформатская, методистская, католическая церкви, евангельские христиане-баптисты.

Религиозные объединения некоторых культов не имеют своих центров. Так сложилось исторически, и вопроса о создании таких центров верующие не поднимают. Эти объединения имеют равные права со всеми другими общинами и группами верующих. Например, евреи-иудеи, не имеющие своего религиозного центра в Советском Союзе, отправляют обряды своей религии в синагогах и миньянах, которые есть в различных населенных пунктах страны.

При Совете Министров СССР действует Совет по делам религий, который регулирует отношения между государством и церковью. Важнейшей его функцией является осуществление контроля за правильным проведением политики государства в отношении религии и церкви, соблюдением законодательства о религиозных культах, обеспечивающих действительную свободу совести. В тех случаях, когда отдельные должностные лица допускают неправильные действия в отношении церкви и верующих, по представлению Совета по делам религий по ним принимаются необходимые решения, а виновные привлекаются к ответственности. Никакого самоуправства, никакого насилия над совестью верующих граждан — такова стержневая линия Советского государства в отношении религии и церкви.

А. КОНДРАТЬЕВ.
(АПН).

ЧАСОПІС, ЯКІ СТВАРАЮЦЬ ЛІТАРАТАРЫ

ПЯТНАЦЦАЦІ РЭСПУБЛІК

ЛЯ ВЫТОКАЎ СТАЯЎ МАКСІМ ГОРКІ

Карэспандэнт Агенцтва друку Навіны гутарыць з галоўным рэдактарам часопіса «Дружба народов», вядомым пісьменнікам Сяргеем БАРУЗДЗІНЫМ.

— Хто быў ініцыятарам гэтага па-свойму унікальнага выдання?

— Ля вытокаў часопіса, — гаворыць Баруздзін, — стаяў Максім Горкі. У 1934 годзе, выступаючы на I Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў, ён ахарактарызаваў савецкую літаратуру як многанацыянальную і выказаў думку, што неабходна знаёміць з творчасцю пісьменнікаў саюзных рэспублік шырокага чытача.

У 1939 годзе выйшаў першы нумар альманаха «Дружба народов», а з 1955 ён стаў штомесячным літаратурна-мастацкім і грамадска-палітычным часопісам. За прайшоўшы з тае пары час выданне, натуральна, вельмі змянілася. Перш за ўсё значна павялічыўся яго тыраж — з 19 да 240 тысяч. Намнога пашырылася кола аўтараў, дыяпазон жанраў. Гэтыя змяненні ў першую чаргу — вынік развіцця самой савецкай многанацыянальнай літаратуры. Больш пяцідзесяці народаў, якія не мелі да рэвалюцыі нават сваёй пісьменнасці, «вылучылі» нямала першакласных пісьменнікаў.

Ленінская нацыянальная палітыка, накіраваная на дасягненне сацыяльнай, эканамічнай і культурнай роўнасці ўсіх народаў, прывяла да росквіту разнастайных пісьменніцкіх індывідуальнасцей, кожная з якіх уносіць у літаратуру свае фарбы, сваё бачанне свету, сваё разуменне мінулага, сучаснага і будучага. Гэта і вызначае ўсё большую цікавасць да часопіса, які друкуе лепшае з лепшага ў нацыянальных літаратурах.

— Па якому прынцыпу адбіраюцца ў вас творы для публікацыі?

— Мы не прытрымліваемся ніякіх зададзеных прапорцый, не імкнёмся, каб у нас у нейкай пэўнай чарговасці былі прадстаўлены ўзоры прозы або паэзіі ўсіх нацыянальных літаратур СССР. Друкуем тое, што выходзіць за рамкі вузка нацыянальнага і ўяўляе агульнасаюзную значнасць, гэта значыць Літаратуру з вялікай літары.

— Хто іменна згодна гэтаму прынцыпу «вяршыць суд» і фарміруе рэдакцыйны партфель?

— Рашаючае слова за рэдакцыйнай калегіяй часопіса. У яе ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх нацыянальных рэгіёнаў нашай краіны. Яны не толькі выбіраюць з прапанаванага, але і шмат ездзяць па рэспубліках, сочаць за ўсім новым, што з'яўляецца ў той або іншай нацыянальнай літаратуры. Акрамя таго, «Дружба народов», як орган Саюза пісьменнікаў СССР, улічвае інфармацыю, што паступае ад працуючых у гэтай творчай арганізацыі літаратурных кансультантаў па ўсіх пятнаццаці саюзных рэспубліках.

Як і ў іншых часопісаў, ёсць і ў нас кола пастаянных аўтараў. Аднак наш прынцып адбору застаецца ў сіле і ў стаўленні да іх.

— «Дружба народов», відавочна, адкрыла нямала самабытных талентаў?

— Практычна ўсе буйныя пісьменнікі саюзных рэспублік набывалі вядомасць праз наш часопіс. Гэта датычыцца, напрыклад, такіх значных літаратурных імёнаў, як кіргіз Чынгіз Айтматаў, украінец Алесь Ганчар, аварац Расул Гамзатаў, грузін Надар Думбадзе і многія іншыя.

— На старонках часопіса публікуюцца творы і рускіх аўтараў...

— Руская літаратура, класічная і сучасная, заўсёды рабіла і робіць уплыў на развіццё нацыянальных савецкіх літаратур. Без рускай прозы і паэзіі «Дружбу народов» я проста не ўяўляю. Гэта значыла б абядніць уяўленне чытачоў аб развіцці літаратурнага працэсу ў цэлым. У нашым часопісе друкаваліся Юрый Трыфанаў, Сяргей Залыгін, Канстанцін Сімонаў і многія іншыя буйныя майстры слова.

У той жа час сёння зусім справядліва адзначаюць і «зваротны працэс» —уздзеянне нацыянальных літаратур на рускую. Напрыклад, раманы і аповесці беларускіх пісьменнікаў Алеся Адамовіча, Івана Шамякіна, Васіля Быкава многае дадалі ў асэнсаванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Канстанцін Сімонаў, які стварыў выдатныя творы пра вайну, аднойчы сказаў мне: «Я многаму вучуся ў Быкава. Вучуся, як пісаць вайну...» Бясспрэчны ўплыў на савецкі філасофскі раман кіргізскага пісьменніка Чынгіза Айтматава. Прыклады можна працягваць.

— Ці заўсёды ёсць упэўненасць, што мастацкі пераклад зроблены на ўзроўні арыгінала?

— Агульнапрызнана, што савецкая школа перакладу — адна з мацнейшых у свеце. Аднак справа перакладу мастацкай літаратуры з моў іншых народаў СССР на рускую і наадварот ідзе не зусім добра. Яшчэ многа праблем трэба вырашыць у сувязі з падрыхтоўкай кадраў перакладчыкаў.

Вопыт, варты распаўсюджання, ёсць. Напрыклад, урад Грузінскай ССР арганізаваў камісію па мастацкаму перакладу. Яна забяспечвае, у прыватнасці, стварэнне так званых падрадкоўнікаў на рускай мове ўсяго лепшага, што з'яўляецца ў грузінскай прозе і паэзіі. Гэта дапамагае аператыўна і на высокім узроўні рабіць пераклады.

Добра ідзе справа з перакладам на рускую мову літоўскай і эстонскай літаратур: пісьменнікі гэтых Прыбалтыйскіх рэспублік устанавілі цесныя кантакты з літаратарамі Масквы, Ленінграда.

Некаторыя пісьменнікі, у тым ліку Айтматаў, чукча Юрый Рытхэў, у апошні час пішуць свае творы па-руску, што, натуральна, аблягчае справу. Падкрэсліваю, што гэта зусім не пазбаўляе іх творчасць самабытнасці, нацыянальнай адметнасці.

— «Дружба народов» — адзіны з «тоўстых» часопісаў, які выпускае дадатак у выглядзе асобных выданняў. Які іх характар?

— Гэта адна з нашых даўніх традыцый. Як дадатак да часопіса мы ўжо выпусцілі шматтомныя зборы твораў класікаў многанацыянальнай савецкай літаратуры «Библиотеку исторического романа», «Библиотеку «Дружбы народов»... З мінулага года пачаты выпуск 50-томнай «Золотой библиотеки», у якую ўвойдуць лепшыя творы савецкіх пісьменнікаў.

— А што цікавага з'явіцца ўжо сёлета — у год 60-годдзя ўтварэння СССР?

— Гэтую дату мы мяркуем адзначыць зноў-такі не столькі «геаграфічнай» шырынёй ахопу нацыянальных літаратур, колькі паказам іх сталасці, арыгінальнасці, мастацкіх вартасцей. Першы нумар гэтага года быў цалкам прысвечаны апавяданню —жанру найбольш ёмістаму, аператыўнаму. Больш за 20 аўтараў стварылі на старонках часопіса панараму сённяшняга жыцця нашай краіны.

У бліжэйшых нумарах будуць апублікаваны раманы і аповесці вядомых пісьменнікаў — рускага Сяргея Залыгіна, эстонца Яна Кроса, армяніна Гранта Матэвасяна, літоўца Міколаса Слуцкіса...

Гутарку вёў Валерый САНКОЎ.

ГЛЫБОКІЯ ТЭМЫ, ДАСКАНАЛАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ

ВЕРЫЦЬ У ЖЫЦЦЁ

Ці варта шукаць філасофскі сэнс у з'явах прыроды або крытычна ацэньваць форму кроны дрэва і кампазіцыйную рытміку рачных хваляў, вышукваць заганы ў натуральным сілуэце пагоркаў? Кожная праява жыццёвых сіл зямлі мае сваю завершанасць, дасканаласць, таму мастак дасягае найбольшай выразнасці, калі вучыцца ў роднай зямлі. Знайсці сябе, пракласці свой шлях, як рака прамывае сабе рэчышча, — мэта кожнай творчай асобы.

Але ў мастацтва ёсць і сацыяльная функцыя. І трэба мець сапраўдны талент, грамадзянскасць, каб падпарадкаваць уласную творчасць патрабаванням часу. Гэта актуальна і ў тым выпадку, калі для ўвасаблення бяруцца вечныя тэмы: каханне, мацярынства, барацьба са злом. Зразумела, калі адлюстроўваюцца не абстрактныя ідэі, а канкрэтныя турботы і радасці сучаснікаў мастака.

Пра гэта сведчыць уся гісторыя мастацтва. Многае з таго, што было блізка і дорага людзям мінулых эпох, блізка і дорага нам сёння...

«Вечныя тэмы» вабяць і маладога беларускага скульптара Аляксандра Мятліцкага. Знешнія падзеі ягонай творчай біяграфіі пакуль змяшчаюцца ў некалькіх радках. Вучоба ў рэспубліканскай школе-інтэрнаце па выяўленчаму мастацтву, потым аддзяленне скульптуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, які ён скончыў у 1977 годзе, служба ў арміі, самастойная праца па спецыяльнасці. Зараз Аляксандр Мятліцкі — член Саюза мастакоў рэспублікі, удзельнік шматлікіх выставак.

Сярод майстроў сусветнага мастацтва, што аказалі ўплыў на фарміраванне яго творчай манеры, былі скульптар з Англіі Генры Мур і румын Канстанцін Брынкуш.

Мастацтвазнаўцы па-рознаму ставіліся да іх творчасці, шмат было спрэчак, дыскусій, у час якіх больш выразна вылучалася самае каштоўнае ў дзейнасці майстроў. І цяпер ніхто не аспрэчвае ўклад гэтых карыфеяў у прагрэсіўную культуру XX стагоддзя. Генры Муру належаць словы: «Я лічу, скульптура павінна несці ў сабе жыццё. У ёй павінна быць адчуванне натуральнай арганічнай формы, пачуццё і цяпло. Таму я ніколі не спрабаваў быць чыста абстрактным мастаком. Быць мастаком — значыць верыць у жыццё».

Элементы народнай архітэктуры, вобразы народнага мастацтва скарыстоўваў у сваіх скульптурах Канстанцін Брынкуш. Яго раннія творы зацікавілі самога Радэна, і той прапанаваў маладому скульптару сваю майстэрню. І хоць Брынкуш паважаў вялікага майстра, ён адмовіўся, бо шукаў свой асабісты шлях у мастацтве. «У ценю вялікага дрэва нічога не расце», —адказаў ён.

Пра такіх мастакоў, як Мур і Брынкуш, кажуць, што яны трымаюць руку на пульсе эпохі. І вось у гэтых двух майстроў Аляксандр Мятліцкі, паводле яго слоў, вучыўся «даводзіць форму да звону».

Адной з самых важных падзей быў для скульптара ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Дзяцінства, абпаленае вайною».

Для нашага краю, для нашага мастацтва вайна, можна сказаць, традыцыйная, вечна трагічная тэма, бо цяжка пералічыць усе войны, якія пракаціліся па зямлі Беларусі. Вялікая Айчынная і зараз жыве ў нашай свядомасці, хаця нарадзілася і вырасла на мірнай зямлі новае пакаленне людзей.

У гонар тых, хто разам з бацькамі вынес цяжар вайны, плануецца стварыць мемарыял. І сярод праектаў, прадстаўленых на конкурс, праца Аляксандра Мятліцкага і архітэктара Уладзіміра Бачкова—адна з лепшых.

Аўтары скарысталі традыцыйную для мемарыялаў форму — узгорак, курган. Але арыгінальна развілі далей сваю задуму. Унутры ўзгорка — амфітэатр, нібы варонка ад выбуху. У цэнтры — скульптурная кампазіцыя з чорнага граніту «Дзеці вайны». Прыступкі, што вядуць да яе ўніз, як кругі ваеннага пекла. І замыкаецца ўвесь ансамбль кампазіцыяй, што ўспрымаецца як лес з калючага дроту.

Завершанасць мемарыялу надаюць некалькі дэкаратыўных кампазіцый, што сімвалізуюць радасць мірнага жыцця, заваяванага ў жорсткай барацьбе.

Наогул твор выклікае самыя розныя асацыяцыі, і гэта сведчыць аб глыбіні аўтарскай задумы.

Другая важная падзея адбылася ў жыцці Аляксандра Мятліцкага аднолькова нядаўна. Ён стаў лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола. Узнагароджаны адзначана скульптура «Трывожны час. 1919 год». Калі глядзіш на гэтую працу, то ўспамінаюцца словы Леніна аб тым, што кожная рэвалюцыя толькі тады чаго-небудзь варта, калі яна можа сябе абараніць. У лаканічнай, поўнай дынамікі імклівасці кампазіцыі мы бачым Фелікса Дзяржынскага, узброенага рабочага і самога правадыра сусветнага пралетарыяту — Леніна. Ён з перавязанай рукой, як салдат, паранены ў баі. Рэвалюцыя абараняецца, абараняецца наступаючы. За ёй канчатковая перамога.

«Быць мастаком — значыць верыць у жыццё». Гэта вера адчуваецца ў любым творы Аляксандра Мятліцкага. Адна з любімых тэм скульптара — мацярынства. Ёй прысвечана шмат работ у мармуры, бронзе, дрэве. «Партрэт жонкі і дачкі», «Мацярынства», «Урадлівасць», «Маці і дзіця» —гэтыя працы створаны ў розныя гады, але аб'яднаны адзінай творчай канцэпцыяй.

Да некаторых твораў Мятліцкага не падыходзяць звычайныя крытэрыі жанравай скульптуры. Аўтар нібы імкнецца ў першую чаргу раскрыць перад гледачом не сюжэт, а натуральную прыгажосць матэрыялу — каменю, дрэва, металу. Самыя, на першы погляд, звычайныя праявы жыцця даводзіць ён да эстэтычнага сімвала. Так, як, напрыклад, у кампазіцыях «Ураджай», «Хваля».

Малады скульптар валодае якасцямі сапраўднага мастака: уменнем вырашаць тэмы сённяшняга дня як «вечныя» і рабіць пазачасавыя тэмы блізкімі сучасніку. Як рака ні на хвіліну не можа спыніць свой бег, так і мастак не можа спыніцца ў творчым пошуку. І ў скульптуры, якую ён заканчвае сёння, заўжды можна ўбачыць пачатак працы, за якую ён возьмецца заўтра.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

У Мінску прайшлі гастролі Кіеўскага акадэмічнага ўкраінскага тэатра імя І. Франка. У вольны ад спектакляў час артысты з цікавасцю знаёміліся са сталіцай брацкай Беларусі.
НА ЗДЫМКУ: артысты тэатра на вуліцах Мінска.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

Мінула сто гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы, а да творчасці вялікага песняра Беларусі і ў нашы дні звяртаюцца людзі як да жыватворнай крыніцы.

Выражэннем бязмернай любові да генія беларускай літаратуры стала гарадское свята «Палымянае слова паэта». Яно сабрала ў парку імя Янкі Купалы мінчан і гасцей сталіцы — шматлікіх паклоннікаў таленту вялікага беларускага паэта. Слова аб паэце сказалі дырэктар музея Янкі Купалы А. Кулакоўскі, слесар-інструментальшчык выторчага аб'яднання «Гарызонт» Н. Дзямідаў, токар Мінскага трактарнага завода А. Кеда і іншыя. Вершы, прысвечаныя Купалу, чыталі беларускія паэты. Бессмяротная купалаўская муза панавала ў гэты дзень у парку над Свіслаччу. Гучалі песні, музыка беларускіх кампазітараў.

НА ЗДЫМКАХ: у час святкавання ля помніка Я. КУПАЛУ; іграе цымбаліст Аляксандр ЛЯВОНЧЫК; выступае фальклорная група Палаца культуры Белсаўпрофа; вершы, прысвечаныя песняру, чытае паэт Уладзімір НЯКЛЯЕЎ.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

У РАМАНАЎЦЫ НА ПАЛЕССІ

ПЕСНЯ—ПУНСОВАЯ КВЕТКА

«Не ведаю, як другім фалькларыстам, але мне заўсёды было цяжка перадчасна ехаць з якой-небудзь мясцовасці. Мне ўсё здавалася, што за зіму, якую я прабуду ў горадзе, тут памрэ нейкая бабуля, якая адна, разумееце, адна ведае зараз чароўны стары сказ. І гэты сказ памрэ з ёю, і ніхто, ніхто яго не пачуе, а я і мой народ застанёмся абкрадзенымі». Гэтак гаворыць герой аднаго з раманаў Уладзіміра Караткевіча. Тады на Беларусі быў «этнаграфічны рай», бо збіральніцтвам вуснай творчасці народа займаліся адзінкі. І хаця сёння народныя песні запісваюць сотні прафесійных фалькларыстаў, незлічоная колькасць папросту цікаўных людзей, кожны з нас, даследчыкаў і аматараў, з першароднай сілай успрымае перасцярогу пісьменніка: не спазніцца, не ўпусціць...

Ты, дуброва, ты, зялёна,
Цераз цябе шлях-дарога,
Цераз цябе купцы едуць,
На дуброве дубцы рэжуць,
На корані агонь кладуць...

Спяваная нягучна, з выдзяленнем кожнага моўнага і меладыйнага акцэнту, песня струменіцца з хаты, запаўняе сабою двор, выходзіць на вуліцу і сягае аж за ваколіцы вёскі, узлятае да вячэрняга зорнага неба, растае рэхам у лесе... Варыянт гэтага твора яшчэ ў XIX стагоддзі запісаў вядомы фалькларыст Міхал Федароўскі. Колькі навальніц адгрымела за гэты час над Беларуссю! А песня жыве. Толькі ў самым нязначным дазваляе яна змяняць сябе, нязменна застаючыся выражэннем пакуты, плачам жонкі, якая не дачакалася з вайны мужа:

Усе мужы з вайны едуць,
Маго мужа каня ведуць.
Ву салдаты, ву жынеры,
Дзе ву маго мужа дзелі,
Дзе ву яго каня ўзелі?

Завуць спявачку Шчэбет Ева. Ёй 75 год. Шмат на Мазыршчыне, ды і ў самой Раманаўцы, дзе запісваў я гэтую песню, такіх пяюнь. Іх галасы, слых, талент—не з музычных школ, бо школай была ім чароўная палеская прырода, мазольная сялянская праца, маці родная ды нялёгкая жаночая доля...

Узялі каня на дуброві,
Ляжыць мілы ў чыстым полі,
У правай руцэ руж'е дзержыць,
А леваю росы бярэ,
Па сырданьку паліває,
Таварышам прамаўляе...

Спявае і дачка бабы Евы—Жэня. Больш за 50 песень выканалі яны ў той вечар. І амаль усе—пра жаночую долю, нешчаслівы і падневольны шлюб. І паўсюль лёс кабеты неадрыўны ад лёсу дзецюка, які арэ поле, косіць, ваюе ці служыць у войску...

— Таварышы, братцы мае,
Як пуйдзеце ў краі мае,
Накажэце жане маёй,
Няхай яна мяне не жджэ,
Няхай яна замуж ідзе...

Некалі ў далёкай ад цэнтральных шляхоў палескай вёсцы Раманаўцы песня была асноўнай адзнакай духоўнай творчасці беларускага селяніна. У песні—яго неадрыўнасць ад прыроды. І ў песнях ён—добры і гуманны ўладар прыроды. Песня—пунсовая кветка сярод шэрай будзённасці бясконцай працы.

Жанчыны спяваюць, а хата паступова напаўняецца моладдзю. Як некалі на вячоркі, прыходзяць яны, пачуўшы колішнюю песню. Стаяць нерухома, быццам выйшлі нечакана да нечага важнага і велічнага, слухаюць.

Цётка Жэня яшчэ цягне апошнія словы, а баба Ева ўжо звяртаецца да маладых:

— Дзеткі, дапамажыце старой, бо не можна ўжэ ж... Такая песня доўгая трапілася.

А ў адказ:

Няхай не йдзе за салдата,
Няхай ідзе за жынера.
За салдатам гора ймецца,
Ня раз, ня два наплачэцца.
За жынером добрэ будзе,
Яна мяне не забудзе...

Спяваў не этнаграфічны ансамбль. Часам прабівалася нязладжанасць, выпадковыя дысанансы... Людзі ж сабраліся адусюль: хто з фермы, хто з мястэчка, хто з пакосу. Спявалі ахвотна, і на тварах праменьчыкам грала шчасце, бо гэтая крынічна чыстая песня забіралася ў самае сэрца і прымушала верыць, што скарб гэты не знікне ніколі, як ніколі не загіне душа народа.

Сяргей ДУБАВЕЦ.

ЯНКА КУПАЛА—СЯБРА БРАТНЯГА ЎКРАІНСКАГА НАРОДА

ЯГО ЛЮБІЛІ, ЯК БАЦЬКУ...

ПЕРШЫ пераклаў творы Янкі Купалы на ўкраінскую мову Паўло Тычына. Гэта быў верш «Як цвіла каліна ў лесе». Сустрэча Я. Купалы з П. Тычынам у 1926 годзе ў Харкаве паклала пачатак іх шчыраму сяброўству.

У гады вайны многія пісьменнікі страцілі свае архівы, у тым ліку і Паўло Тычына. Толькі нейкім цудам захаваўся ў яго адзін ліст ад Янкі Купалы. 8 мая 1930 года Іван Дамінікавіч пісаў: «Вельмі паважаны і дарагі Паўло Грыгоравіч!

Хацелася б мне даведацца ад Вас, як стаіць справа з маім зборнікам перакладаў на ўкраінскую мову... Я шчыра прасіў бы Вас, Паўло Грыгоравіч, як-небудзь гэту справу пасунуць наперад... Шчыра Вам дзякую за Вашу кніжку. Як толькі выйдзе мой новы том, я зараз жа Вам вышлю. Мне хацелася б самому паехаць у Харкаў, але, не ведаючы, як справа з маёй кніжкай, баюся патраціць даремна час...»

У канцы ліста Іван Дамінікавіч паведамляе: «Беларускае дзяржаўнае выдавецтва вырашыла выдаць на беларускай мове творы Шаўчэнкі. Мне прапануюць узяць на сябе хоць частку перакладаў і агульную рэдакцыю.

Як Вы, Паўло Грыгоравіч, глядзіце на гэту справу?

Чакаючы ад Вас адказу, застаюся шчыра Вам удзячны.

Янка Купала.

Прывітанне ўсім знаёмым пісьменнікам».

Жонка Паўла Тычыны Лідзія Пятроўна расказала, што муж высока цаніў паэзію Янкі Купалы і часта на памяць, у арыгінале чытаў сваім гасцям яго творы.

У 1939 годзе ў Кіеве адбыўся Усесаюзны пленум, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі. У склад ганаровага прэзідыума ад беларускай дэлегацыі былі абраны Янка Купала, Якуб Колас і Міхась Лынькоў.

Выступаючы на пленуме, Янка Купала гаварыў пра адзінства двух братніх народаў — беларускага і ўкраінскага, пра тое, што здзейсніліся мары Тараса Шаўчэнкі аб братэрстве, пра магутны ўплыў творчасці вялікага паэта на ўсю савецкую літаратуру.

Закончыў Купала сваю прамову словамі: «Мне, таварышы, даручана ў знак гэтага вялікага і непарушнага брацтва перадаць сціплы падарунак беларускіх пісьменнікаў — партрэт Тараса Шаўчэнкі. Партрэт зроблены ў Мінску майстрам радыёзавода Гебелевым з некалькіх тысяч кавалачкаў натуральнага дрэва. Тут ёсць вельмі рэдкія пароды дрэў, якія ўпрыгожваюць нашу Беларусь. Магчыма, што тут ёсць кавалачкі і тых стогадовых дрэў, якія некалі журботна шумелі над галавой Тараса Шаўчэнкі, калі ён прыгонным памешчыка Энгельгарта ішоў беларускімі лясамі з Вільні ў Пецярбург».

Дарэчы, гэты арыгінальны партрэт славутага сына Украіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў надзейна схаваны кіяўлянамі і ў нашы дні экспануецца ў адной з залаў Дзяржаўнага музея Тараса Шаўчэнкі.

...Неяк, будучы ў Палтаве, я наведаў дом-музей У. Караленкі. Я вельмі ўзрадаваўся, калі ўбачыў сярод экспанатаў «Жалейку» Янкі Купалы. Кніжка мела яшчэ добры выгляд. На тытульным аркушы — купалаўскі аўтограф: «Вельмі паважанаму пану У. Г. Караленку ў знак шчырай пашаны яго працы на полі грамадзянскім.

СПБ. 7/1—1911 г.

Янка Купала».

Шчырыя адносіны звязвалі Янку Купалу і з украінскім паэтам і празаікам Т. Масэнкам. Пазнаёміліся яны ў 1928 годзе ў Мінску, куды Масэнка прыязджаў у складзе дэлегацыі ўкраінскіх пісьменнікаў. Менавіта тады нарадзіліся крылатыя радкі Уладзіміра Сасюры:

Біларусь ти моя, Біларусь,
Синьоока сэстра Украіни!

Вярнуўшыся дамоў, Масэнка перакладае вершы Купалы і друкуе іх у газетах і часопісах. Пазней Дзяржаўнае выдавецтва Украіны вырашыла выдаць асобнай кніжкай паэму Янкі Купалы «Над ракой Арэсай». Пераклад быў даручаны Тэрэню Масэнку, а Паўло Тычына даў згоду быць рэдактарам. Увосень 1936 года гэтае выданне Т. Масэнка прывёз у Мінск і падарыў Купалу. Івана Дамінікавіча дужа ўзрадавала яго кніжка, выдадзеная на Украіне. Пасля той сустрэчы ўкраінскі паэт пісаў пра Янку Купалу:

«Як цяпер, памятаюцца строга сціснутыя вусны, вострая лінія якіх сведчыла аб удумлівым і моцным характары. У ім заўсёды адчувалася ўпэўненасць і лагодны спакой, нейкі асаблівы чалавечы такт. Усё гэта прыхавана недзе там, за суровымі брывамі і крыху сумнымі вачыма. Не хмурая, а цёплая ўсмешка вабіць да сябе людзей...

Усё падабалася ў ім. Яго любілі, як бацьку, бо Янка Купала для нас быў цудоўным прыкладам сапраўднага чалавека». Сваю павагу да песняра ўкраінцы выказалі абраннем яго акадэмікам Акадэміі навук УССР.

Вершы і паэмы Янкі Купалы перакладалі на ўкраінскую мову таксама Максім Рыльскі, Андрэй Малышка, Іван Няхода, Мікола Цярэшчанка, Сцяпан Крыжаніўскі, Пятро Дарошка, Мікола Нагнібяда, Алесь Жолдак, Алекса Юшчанка і іншыя. Пра творчасць Купалы напісана шмат артыкулаў украінскімі вучонымі і літаратарамі. Цудоўныя творы Купалы гучаць па Украінскім радыё і тэлебачанні, іх чытаюць на літаратурных вечарах, у тэатрах з поспехам ідуць спектаклі па купалаўскіх п'есах.

Аляксей СЛЕСАРЭНКА.

Імя Уладзіміра АЛЯХНОВІЧА добра вядома нашым чытачам. Яго замалёўкі пра прыроду часта друкаваліся на старонках «Голасу Радзімы». Ім напісаны дзве кнігі прозы — «Палеская навела» і «Ля самага небасхілу», зборнік паэзіі «Мора летуценняў».

У. Аляхновіч не прафесійны пісьменнік. Некаторы час ён працаваў геолагам, інжынерам, журналістам, зараз — супрацоўнік аднаго з мінскіх праектных інстытутаў.

Неўзабаве ў друку з'явіцца новая кніга У. Аляхновіча «Легенды кветак». Некалькі абразкоў з яе мы і прапануем сёння ўвазе нашых чытачоў.

НЕЗАБУДКІ

У далёкай краіне некалі жыў юнак Нарым. Ён вельмі любіў кветкі. Асабліва падабаліся яму невысокія, з блакітнымі-блакітнымі, як веснавое неба, пялёсткамі. І любіў іх Нарым таму, што ў яго была каханая дзяўчына з такімі ж, як гэтыя кветкі, блакітнымі вачыма.

Але здарылася нечаканае: яго каханая раптоўна захварэла і неўзабаве памерла.

Тузе Нарыма не было мяжы. Цэлымі днямі ён хадзіў маўклівы па навакольных палях, лугах і пералесках, і ўсё нагадвала тут аб ёй. І рачныя плёсы, і дрэвы, і кветкі...

Нарэшце ён не вытрымаў, прадаў гаспадарку, што засталася ад нябожчыка-бацькі, сеў на карабель і адправіўся ў падарожжа. Перад дарогай сабраў у невялікую скрыначку, акаваную жалезам, спелае насенне з тых блакітных кветак і ўзяў яе з сабою.

Ноччу ў акіяне разыграўся страшэнны шторм. Чорнае неба разразалі бліскавіцы, грукатаў гром, а на маленькі карабель абрушваліся хвалі.

У тую ноч людзі пры святле маланак бачылі на караблі нейкага юнака, ён стаяў, прыхіліўшыся да мачты, і моцна прыціскаў да грудзей скрыначку.

Ранкам старая рыбачка заўважыла чалавека, які ляжаў на пясчанай касе. Гэта быў юнак з пасівелымі, амаль што белымі валасамі. Ён быў ледзь жывы, а ў пасінелых руках сціскаў невялікую скрынку.

Жанчына аднесла юнака ў хаціну, паклала на ложак і напаіла малаком. І тут юнак не выпускаў з рук таямнічую скрынку. Ён праспаў увесь дзень, ноч і толькі раніцою расплюшчыў вочы. Дрыжачымі рукамі працягнуў рыбачцы скрыначку і, перасільваючы слабасць, вымавіў:

— Тут насенне... Высейце яго ў глебу...

Старая выканала жаданне незнаёмца і пасеяла насенне ў агародзе на градах.

За месяц рыбачка выхадзіла юнака, і ён ачуняў. А ў агародзе ўжо буйна цвілі невысокія кветачкі з блакітнымі пялёсткамі.

Нарым пасяліўся ў гэтых месцах і аж да самай смерці разводзіў прыгожыя блакітныя кветкі. У памяць аб каханай ён назваў іх «незабудкамі». Так называюць гэтыя кветкі людзі і да сёння.

НАРЦЫС

На невялікім лузе пры дарозе рос нарцыс. Ён быў звычайны: на высокай ножцы, сем пялёсткаў, пасярод якіх гняздзіліся жоўтыя тычынкі. Ад іншых нарцысаў, што раслі на гэтым лузе, ён адрозніваўся толькі тым, што ў іх пялёсткі былі белыя, а ў яго — жаўтаватыя.

Вясна і лета ў той год выдаліся сухія, дажджы не прыходзілі, і кветкам жылося цяжка на гэтым лузе. Не быў упэўнены, што працягне доўга і жоўты нарцыс.

Але неяк надвячоркам загрукатаў гром, заблiскала маланка і хлынуў цёплы лівень. Глеба хутка напаілася вільгаццю, увабралі з яе сокі кветкі.

Заварушыўся і жоўты нарцыс. Яго пялёсткі разгарнуліся, яшчэ больш пажаўцелі, ножка выпрасталася.

Ад дажджу побач з нарцысам з'явілася невялікая лужына. Калі развіднела, то жоўты нарцыс убачыў у ёй свой адбітак. Пахістаў управа-ўлева галоўкай, нахіліўся ніжэй да вады, каб лепш сябе разгледзець. І тут ён зразумеў, што стаў вельмі прыгожы. Кінуў позірк на іншыя кветкі.

«Не, яны не такія, як я»,— падумаў жоўты нарцыс.—Бледнатварыя, непрыкметныя.

Узышло сонца, працягнула свае ласкавыя прамені да кветак, сагрэла іх. Тыя, удзячныя, задаволена махалі яму галоўкамі. Толькі жоўты нарцыс не быў удзячны сонцу. Ён яшчэ раз кінуў позірк у лужыну, ганарліва задраў галоўку.

— Я жаўцей і ярчэй за цябе! — закрычаў ён сонцу.

Сонца нічога не адказала, а толькі ўсміхнулася і ўсё вышэй і вышэй уздымалася па небасхілу.

«Чаму яно маўчыць, ці не бачыць, які я прыгожы»,— падумаў жоўты нарцыс і зноў хацеў зірнуць у лужыну, каб палюбавацца сабою.

Але тут ён з жахам убачыў, што лужыны няма, а глеба там, дзе яна нядаўна блішчэла, патрэскалася.

— Як ты пасмела выпіць маю лужыну, куды я цяпер буду глядзецца? — закрычаў жоўты нарцыс сонцу.

Тое па-ранейшаму маўчала і ўсё больш прыпякала. Да вечара пялёсткі жоўтага нарцыса зноў згарнуліся, паблякліі, ножка скрывілася і ён зноў стаў такім, якім быў перад дажджом...

ВАЛОШКІ

Было гэта яшчэ тады, калі чалавек толькі навучыўся прыручаць дзікіх жывёл і высяваць жыта.

Сумным у той час было поле. На шэрай патрэсканай зямлі жыты падымаліся невысока, і кветкі ў іх расці не хацелі. Затое побач, на лугах і ў пералесках, красаваліся рамонкі, люцікі, званочкі, фіялкі.

— Ідзіце да нас сюды! — клікалі іх каласы. — Разам весялей будзе жыць!

Але кветкі і слухаць не хацелі, а толькі ганарліва ўзмахвалі галоўкамі.

— Знайшлі куды клікаць. На сухадол. У нас тут вільгаці многа, глеба добрая. Не пойдзем! — адказвалі яны.

Тады каласы паглядзелі на неба, дзе праплывалі прыгожыя пушыстыя воблакі.

— Ідзіце да нас, на зямлю! — паклікалі яны аблокі. — У нас тут утульней, цяплей.

Але тыя нічога не адказалі і, як быццам бы спяшаючыся, яшчэ хутчэй паплылі па небасхілу. З-за іх выглянула вялікае гарачае сонца.

Зусім стала сумна каласам.

Нарэшце прыйшла ноч. Яна прынесла з сабою буйную расу і напаіла ўсё жывое. Акрыялі і каласы. Яны выпрасталіся і зноў паглядзелі ў неба. Увесь нябесны купал быў густа ўсыпаны яркімі зоркамі. Здавалася, што яны выразаны з найтанчэйшага крышталю. Залюбаваліся імі каласы. А зоркі ўздрыгвалі і нібыта падмігвалі ім.

— Ідзіце да нас! — паклікалі іх каласы.

Раптам адна з зорак адарвалася ад небасхілу і паляцела на зямлю. За ёй другая, трэцяя...

Людзі любоўна назвалі зоркі, што ўпалі з неба і ператварыліся ў кветкі, валошкамі. Цяпер яны растуць ва ўсіх жытах.

Уладзімір АЛЯХНОВІЧ.

Больш трохсот школьнікаў з Мінска, а таксама іх госці — каманда вучняў з Вільнюса, прынялі ўдзел у гарадскіх турысцкіх спаборніцтвах, якія праходзілі каля Радашковіч. Юныя турысты аспрэчвалі першынство ў эстафеце, тапаграфічнай здымцы мясцовасці, кантрольна - камбінаваным маршруце. Школьнікі дэманстравалі сваё ўменне правільна арыентавацца на мясцовасці, пераадольваць розныя перашкоды, правільна ставіць палатку, распальваць касцёр і хутка гатаваць абед.

Ва ўпартай барацьбе перамагла каманда Савецкага раёна Мінска, за якую выступалі вучні сярэдняй школы № 19.

НА ЗДЫМКАХ: на адным з этапаў турысцкай эстафеты; тапаграфічную здымку мясцовасці вядуць вучні адной з мінскіх школ.

Фота Г. СЯМЁНАВА.

«ГЛЫБОКІЯ КРЫНІЦЫ»

У парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў у Мінску адбылося этнаграфічнае свята, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі братніх рэспублік Савецкага Саюза — Украіны, Літвы, РСФСР.

Пра пачатак фестывалю народнага і самадзейнага мастацтва паведамілі характэрныя гукі старадаўняга беларускага музычнага інструмента — рога тура (сурмы). Народных артыстаў з гумарам і жартатамі, якія выклікалі вясёлы смех гледачоў, прадстаўляў дзед Мацей (заслужаны артыст БССР М. Шышко). А затым на канцэртных пляцоўках выступілі самадзейныя артысты розных рэгіёнаў Беларусі, фальклорныя ансамблі з вёскі Альшэўка Чарнігаўскай вобласці, з Вільнюса.

Пра мэту правядзення гэтага свята расказала намеснік начальніка Упраўлення культуры Мінгарвыканкома Валянціна Шчытцова:

— Этнаграфічнае свята «Глыбокія крыніцы» праводзіцца ў рамках Усесаюзнага фестывалю масавых святаў і тэатралізаваных прадстаўленняў, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР. У ім прынялі ўдзел народныя калектывы Мінска і Мінскай вобласці і суседніх з імі гарадоў саюзных рэспублік — Смаленска, Чарнігава, Вільнюса. Мэта фестывалю — умацаванне братняй дружбы паміж народамі нашай краіны, захаванне і ўзбагачэнне народных традыцый і абрадаў.

Гумар

Настаўніца кажа: «На мінулым уроку я расказвала вам , як вітаюцца пры сустрэчы людзі ў розных краінах. Адны гавораць: «Як пажываеце?», другія: «Як справы?», трэція: «Добрай раніцы!» або «Дабрыдзень!», чацвёртыя: «Прывітанне!» і г. д. Цяпер я хачу, каб вы сказалі мне, што часцей за ўсё гавораць адзін аднаму пры сустрэчы англічане. Калі ласка, Джон.

— Англічане, міс, гавораць звычайна так: «Чорта ва надвор'е, горш не прыдумаеш...»

ЛОСЬ... НА ЎЗЛЁТНАЙ ПАЛАСЕ

...Чарговы самалёт, паступова збаўляючы хуткасць, імчаўся над узлётна-пасадачнай паласой Мінскага аэрапорта. Яшчэ некалькі секунд — і колы дакрануцца да шэрага палатна бетону. Але раптам лётчык даў поўны газ, і крылатая машына пачала разварочвацца над аэрапортам. «Паласа не свабодная. Раблю яшчэ адзін заход», — пачулася ў дыспетчарскім пункце.

Праз хвіліну ярка-чырвоная машына ваенізаванай аховы імчалася да паласы. Прыбыўшы на месца, работнікі аэрадрома былі здзіўлены: па бетону павольна разгульвала... ласяня. Яно і аказалася «парушальнікам спакою».

Прагнаць ласяня з узлётнай паласы адразу не ўдалося. Госць аказаўся не з баязліўцаў і ў сваю чаргу паспрабаваў збавіцца ад непажаданага суседства, ударыўшы пярэднімі нагамі па дзверцы машыны. Гэта прымусіла работнікаў аэрадрома часова адступіцца. Хутка прыбыло «падмацаванне» — пажарная машына. Моцны струмень вады з брандспойта паказаўся ласяняці не страшным, а наадварот, прыемным. Яно з задавальненнем напілося.

Аб'яднанымі намаганнямі госць быў усё ж выгнаны з паласы. Разумеючы, што пакідаць жывёлу на тэрыторыі аэрадрома нельга, людзі загналі яго ў кут, абгароджаны металічнай сеткай. Апынуўшыся ў ролі палоннага, ласяня горда і незалежна расхаджвала ў загарадцы, робячы выгляд, што не заўважае навокал нікога. Спроба аднаго з рабочых паставіць бліжэй да яго вядро з вадой, ледзь не скончылася бядой.

Пакуль работнікі аэрадрома чакалі прадстаўнікоў Беларускага таварыства аховы прыроды, каб завезці ласяня куды-небудзь у лес, госць вырашыў пакінуць новых знаёмых больш простым спосабам. Заўважыўшы, што ў варотах адсутнічае адзін з металічных прутоў, ён з усяго размаху кінуўся ў шчыліну, вырваўся на волю. А потым з усіх ног кінуўся на другі канец аэрадрома, да глыбокага зарослага хмызняком рова, праз які, відаць, і трапіў на ўзлётную паласу.

Аляксандр ВІЛЬЧЫНСКІ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Зак. 1251